УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Факультэт дадатковай адукацыі

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы прарэктар БДУКМ
______________________Ю.П.Бондар
“____” _________________2012 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЕБНАЯ ПРАГРАМА ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ

# Мастацтва балетмайстра

1-17 02 71 Мастацтва харэаграфічнае

кваліфікацыя: *харэограф-педагог*

у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам перападрыхтоўкі, зацверджаным 03.11.2010 г., рэг.№ 25-17/199

Мінск, 2012

Распрацоўшчык праграмы:

*І. В. Канавальчык,* старшы выкладчык кафедры харэаграфіі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

Рэкамендавана да зацвярджэння:

Саветам факультэта дадатковай адукацыі УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"
Пратакол пасяджэння ад _________ № ______

Навукова-метадычным саветам УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"
Пратакол пасяджэння ад __________ № ______

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# УВОДЗІНЫ

У сістэме прафесійнай адукацыі ў галіне харэаграфічнага мастацтва курс “Мастацтва балетмайстра” з’яўляецца адной з прыярытэтных вучэбных дысцыплін у працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі.

Праграма курса распрацавана ў адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі, якія зацверджаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, улічвае педагагічны і практычны вопыт работы калектыву кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў.

Асноўнай *мэтай* прадмета з’яўляецца падрыхтоўка балетмайстраў, кіраўнікоў прафесійных і аматарскіх харэаграфічных калектываў.

У адпаведнасці са спецыфікай спецыяльнасці “харэаграфічнае мастацтва” праграма прадугледжвае мэтанакіраванае фарміраванне ў будучых спецыялістаў цэласнай сістэмы прафесійных кампетэнцый, якія садзейнічаюць авалоданню сучаснай метадалогіяй пастановачнай работы, прынцыпамі арганізацыі пластычнага матэрыялу, эфектыўным выкарыстаннем інавацыйных тэхналогій пры стварэнні харэаграфічнага твора.

Праграма ахоплівае напрамкі “народны танец”, “бальны танец”, “эстрадны танец” з улікам спецыфічных асаблівасцей дадзеных спецыялізацый.

Метадалагічную аснову прадмета складаюць лекцыйныя і практычныя заняткі, якія праводзяцца на працягу ўсяго перыяду навучання і рэгламентуюцца тэматычным планам для кожнага года навучання.

Лекцыйныя заняткі прадугледжваюць азнаямленне з тэорыяй стварэння харэаграфічнага твора з абавязковым прыцягненнем візуальных (відэазапісаў), акустычных (аўдыязапісаў) і іншых наглядных сродкаў навучання.

На практычных занятках набываюцца веды па арганізацыі і ажыццяўленні пастановачнай дзейнасці, навыкі балетмайстра па стварэнні харэаграфічнага твора, развіваюцца музыкальныя здольнасці слухачоў, адпрацоўваецца методыка вядзення рэпетыцыйнага працэсу.

Частка гадзін прысвечана самастойнай рабоце слухачоў, якая прадугледжвае абавязковае знаёмства з пастановачнай дзейнасцю лепшых мастацкіх калектываў Беларусі, вывучэнне вопыту вядомых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

айчынных і замежных харэографаў з мэтай фарміравання ў будучых балетмайстраў мастацкага густу, пашырэння кругагляду ў сферы прафесійнага майстэрства.

У выніку вывучэння дысцыпліны слухач павінен *ведаць:*

– спецыфіку харэаграфічнага мастацтва;

– асноўную тэрміналогію прадмета;

– этапы і формы пастановачнага і рэпетыцыйнага працэсаў;

– прынцыпы падбору музычнага матэрыялу;

– асноўныя законы стварэння харэаграфічнай кампазіцыі;

– спецыфіку выразных сродкаў харэаграфічнай кампазіцыі;

– прыёмы арганізацыі пластычнага матэрыялу і сцэнічнай прасторы пры стварэнні харэаграфічнай кампазіцыі;

– законы стварэння мастацкага вобраза ў харэаграфічным творы;

– методыку работы з танцавальным фальклорам;

– прынцыпы сцэнічнай інтэрпрэтацыі ўзораў народнай танцавальнай творчасці.

Павінен *умець:*

– арганізоўваць і кіраваць прафесійнымі і аматарскімі танцавальнымі калектывамі;

– валодаць прынцыпамі мастацкага кіравання дзейнасцю прафесійных і аматарскіх танцавальных калектываў;

– працаваць з канцэртмайстрам, кампазітарам, гукааператарам у залежнасці ад віду харэаграфічнай дзейнасці;

– валодаць навыкамі балетмайстарскай дзейнасці;

– выкарыстоўваць прыёмы арганізацыі пластычнага матэрыялу і сцэнічнай прасторы ў працэсе стварэння харэаграфічнай кампазіцыі;

– валодаць законамі ўвасаблення харэаграфічнага вобраза;

– улічваць творчыя і фізічныя асаблівасці выканаўцаў пры стварэнні харэаграфічнай кампазіцыі;

– выкарыстоўваць навыкі пастановачнай работы ў педагагічнай дзейнасці.

Разнастайныя формы кантролю за паспяховасцю навучання прадугледжваюць выяўленне ўзроўню валодання харэографамі тэарэтычным матэрыялам, навыкамі пастановачнай і рэпетыцыйнай работы.

Курс завяршаецца экзаменам, на якім слухач павінен прадставіць самастойны харэаграфічны твор і пацвердзіць свае веды па тэарэтычнай частцы праграмы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Тэмы | Усяго | Колькасць гадзін | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Самостойная работа |
| 1. | Прадмет "Мастацтва балетмайстра", спецыфіка і задачы. Балетмайстар і сфера яго творчай дзейнасці ў харэаграфічным калектыве | 7 | 1 | - | 6 |
| 2. | Харэаграфічная кампазіцыя як сцэнічная форма ўвасаблення мастацкай задумы балетмайстра | 7 | 1 | - | 6 |
| 3. | Лексіка танца як састаўная частка і выразны сродак харэаграфічнай кампазіцыі | 7 | 1 | - | 6 |
| 4. | Малюнак танца як састаўная частка і выразны сродак харэаграфічнай кампазіцыі | 6 | - | - | 6 |
| 5. | Драматургія як ідэйна-змястоўная аснова харэаграфічнай кампазіцыі | 6 | - | - | 6 |
| 6. | Музыка як структурна арганізуючая аснова харэаграфічнай кампазіцыі | 6 | - | - | 6 |
| 7. | Работа балетмайстра па стварэнні харэаграфічнага вобраза | 4 | - | 4 | - |
| 8. | Работа балетмайстра ў дзіцячым харэаграфічным калектыве | 8 | - | 4 | 4 |
| 9. | Работа балетмайстра па стварэнні харэаграфічнай кампазіцыі для дзяцей | 4 | - | 4 | - |
| 10. | Стварэнне сцэнічнай кампазіцыі на аснове беларускага харэаграфічнага фальклору | 4 | - | 4 | - |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 11. | Стварэнне тэатралізаванага прадстаўлення (тэматычнага паказу, харэаграфічнага спектакля, фальклорнай вечарыны) на аснове беларускай народнай танцавальнай творчасці | 4 | - | 4 | - |
| 12. | Стварэнне харэаграфічнай кампазіцыі ў форме сольнага, дуэтнага, камернага танцаў | 4 | - | 4 | - |
| 13. | Прыёмы поліфанічнай перадачы харэаграфічнай фактуры | 7 | 1 | - | 6 |
| 14. | Стварэнне харэаграфічнай кампазіцыі на матэрыяле беларускай народнай творчасці ў сучаснай апрацоўцы | 4 | - | 4 | - |
| 15. | Работа балетмайстра з мастаком па сцэнічным афармленні харэаграфічнай кампазіцыі | 4 | - | 4 | - |
| 16. | Стварэнне арыгінальнай харэаграфічнай кампазіцыі на матэрыяле беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі да экзамену | 16 | - | 8 | 8 |
| **Усяго:** | | **98** | **4** | **40** | **54** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ПРАГРАМЫ

### Тэма 1. Прадмет "Мастацтва балетмайстра", спецыфіка і задачы. Балетмайстар і сфера яго творчай дзейнасці ў харэаграфічным калектыве

Мастацтва балетмайстра як адзін з вядучых вучэбных прадметаў у сферы падрыхтоўкі спецыяліс вышэйшай кваліфікацыі – балетмайстраў харэаграфічных калектываў.

Мастацтва балетмайстра як навука аб мэтанакіраванай і спецыфічна арганізаванай сістэме выхавання будучага балетмайстра.

Роля прадмета ў працэсе падрыхтоўкі спецыяліста высокай харэаграфічнай культуры і прафесійнага майстэрства.

Спецыфіка прадмета, формы правядзення заняткаў, прынцыпы іх арганізацыі ў вучэбным працэсе.

Набыццё ведаў, уменняў і навыкаў з далейшай іх рэалізацыяй у харэаграфічнай практыцы – важнейшая задача ў навучанні будучай спецыяльнасці.

Асноўныя катэгорыі, іх агульная характарыстыка і спецыяльная тэрміналогія.

Узаемасувязь прадмета з тэорыяй, методыкай і практыкай выкладання спецыяльных сумежных дысцыплін.

Узаемадзеянне дадзенага вучэбнага курса з дысцыплінамі грамадска-палітычнага і агульнаадукацыйнага цыклаў, іх уплыў на працэс фарміравання светапогляду балетмайстра, яго грамадзянскай пазіцыі.

Азначэнне прафесіі балетмайстра. Спецыфіка прафесіі балетмайстра ў харэаграфічным калектыве, адрозненне ад прафесіі балетмайстра ў оперы, аперэце, тэатры, на эстрадзе, у цырку.

Балетмайстар – аўтар, стваральнік новых харэаграфічных твораў на матэрыяле розных жанраў сцэнічнай харэаграфіі.

Работа харэографа-пастаноўшчыка ў прафесійным і аматарскім танцавальных калектывах.

Балетмайстар як стваральнік і арганізатар харэаграфічнага ансамбля.

Балетмайстар як мастацкі, ідэйна-творчы кіраўнік харэаграфічнага калектыву.

Балетмайстар як стваральнік танцавальных твораў для рэпертуару харэаграфічнага ансамбля.

Балетмайстар як рэжысёр-пастаноўшчык танцавальных нумароў.

Балетмайстар як рэпетытар створаных харэаграфічных твораў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Балетмайстар як псіхолаг і педагог-выхавацель удзельнікаў харэаграфічнага калектыву.

**Тэма 2. Харэаграфічная кампазіцыя як сцэнічная форма ўвасаблення мастацкай задумы балетмайстра**

Азначэнне паняцця “харэаграфічная кампазіцыя”, яе функцыі і ўласцівасці.

Работа балетмайстра па стварэнні харэаграфічнай кампазіцыі.

Харэаграфічная кампазіцыя як сцэнічная форма ўвасаблення мастацкай задумы балетмайстра.

Форма танцавальнага твора як эстэтычная катэгорыя мастацкага цэлага. Знешняя і ўнутраная форма сцэнічнай кампазіцыі, параўнальная характарыстыка.

Узаемаабумоўленасць і суадносіны формы і зместу ў харэаграфічным творы.

Сцэнічная форма як спосаб існавання і развіцця мастацкага зместу.

Харэаграфічная кампазіцыя як сцэнічная форма арганізацыі і суадносін выразных сродкаў танца.

Выразныя сродкі танца, іх функцыі і адметныя асаблівасці.

**Тэма 3. Лексіка танца як састаўная частка і выразны сродак харэаграфічнай кампазіцыі**

Азначэнне паняцця “лексіка танца”, яе спецыфіка і функцыі ў працэсе стварэння харэаграфічнай кампазіцыі.

Народны танец як адна з крыніц стварэння лексікі танцавальнага твора.

Асноўныя групы лексічнага фонду народнага танца, іх класіфікацыя і сціслая характарыстыка.

Узаемазалежнасць харэаграфічнага твора і мастацкай задумы балетмайстра, ідэі і драматургіі сцэнічнай кампазіцыі.

Узаемасувязь танцавальнай лексікі і характару, структуры музычнага матэрыялу.

Узаемасувязь харэаграфічнай лексікі і малюнка танца.

Залежнасць пластычнай мовы ад характарыстыкі дзеючых асоб.

Пластычная выразнасць і сродкі яе ўвасаблення ў харэаграфічнай кампазіцыі.

Пантаміма як самастойны жанр сцэнічнага мастацтва і як адзін з галоўных сродкаў пластычнай выразнасці.

Пантаміма ў харэаграфічным мастацтве, яе спецыфіка і адметныя асаблівасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Суадносіны танца і пантамімы ў харэаграфічным творы.

Міміка і пластыка рук – сродкі пластычнай выразнасці ў замалёўцы харэаграфічнага вобраза.

Традыцыйная і наватарская лексіка танца, спосабы яе стварэння і развіцця ў сцэнічнай кампазіцыі.

Методыка работы балетмайстра па стварэнні харэаграфічнай лексікі.

Паняцце "матыў" у харэаграфічным мастацтве, спецыфіка і функцыі пры стварэнні харэаграфічнай кампазіцыі.

Параўнальная характарыстыка музычнага і пластычнага матываў.

Пластычны матыў як найменшая структурная адзінка танцавальнага вобраза.

Пластычны матыў як інтанацыйна-выразны элемент харэаграфічнага вобраза.

Методыка стварэння пластычнага матыву ў працэсе працы над танцавальным вобразам.

**Тэма 4. Малюнак танца як састаўная частка і выразны сродак харэаграфічнай кампазіцыі**

Азначэнне паняцця "малюнак танца", яго спецыфіка і функцыі ў працэсе стварэння харэаграфічнай кампазіцыі.

Размеркаванне малюнка танца адносна прасторы сцэнічнай пляцоўкі, узаемасувязь і ўзаемазалежнасць малюнка танца і ўспрымання гледачамі.

Абумоўленасць прасторавага малюнка танца мастацкай задумай балетмайстра, зместам танцавальнага твора.

Узаемасувязь і ўзаемазалежнасць прасторавага малюнка танца і характару, структуры музычнага матэрыялу.

Узаемадзеянне малюнка танца з харэаграфічнай лексікай, пластычнай характарыстыкай дзеючых асоб.

Віды малюнкаў танца ў харэаграфічнай кампазіцыі, іх разнастайнасць і прасторавыя пабудовы.

Азначэнне паняцця "вобразны малюнак танца", узаемасувязь з мастацкай задумай балетмайстра.

Прынцыпы пабудовы малюнка танца на сцэнічнай пляцоўцы.

**Тэма 5. Драматургія як ідэйна-змястоўная аснова харэаграфічнай кампазіцыі**

Драматургія ў харэаграфічным мастацтве, яе спецыфіка і функцыі ў танцавальным творы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Харэаграфічная і музычная драматургія, узаемасувязь і ўзаемазалежнасць.

Балетмайстар як аўтар-драматург танцавальнага твора.

Балетмайстар як рэжысёр танцавальнага твора.

Законы стварэння харэаграфічнай кампазіцыі.

Харэаграфічная кампазіцыя як форма драматургічнага ўвасаблення мастацкай задумы балетмайстра.

Асноўныя катэгорыі драматургічнага развіцця: тэма, ідэя, звышзадача, скразное дзеянне, фабула, сюжэт.

Мастацкая задума – першапачатковы творчы этап працэсу стварэння драматургіі харэаграфічнага твора.

Збор і аналіз матэрыялу, вывучэнне інфармацыйных крыніц для рэалізацыі мастацкай задумы (твораў жывапісу, літаратуры, мультыплікацыі, мастацкіх, дакументальных, гістарычных, этнаграфічных, фальклорных матэрыялаў і г. д.).

Тэма і ідэя як састаўныя кампаненты харэаграфічнай драматургіі.

Звышзадача і скразное дзеянне як метады рэалізацыі ідэйнага зместу танцавальнага твора.

Фабула і сюжэт харэаграфічнай кампазіцыі, параўнальная характарыстыка.

Сюжэт у харэаграфічнай кампазіцыі і асноўныя этапы яго развіцця.

Работа балетмайстра па распрацоўцы праграмы, кампазіцыйнага плана і лібрэта.

Праграма – дакладнае, паслядоўнае апісанне харэаграфічнага дзеяння, пабудаванага па законах драматургічнага развіцця.

Асаблівасці работы балетмайстра па стварэнні праграмы на аснове літаратурнага, гістарычнага, фальклорнага і іншых першакрыніц мастацкай творчасці.

Праграма як аснова для стварэння кампазіцыйнага плана.

Кампазіцыйны план – дэталізаваны, разгорнуты сцэнарый харэаграфічнага дзеяння, які ўключае распрацоўку тэмы, ідэі, сюжэта будучай пастаноўкі.

Лібрэта – кароткі пераказ дзеяння, апісанне зместу гатовага танцавальнага твора.

**Тэма 6. Музыка як структурна арганізуючая аснова харэаграфічнай кампазіцыі**

Музычны матэрыял – аснова работы балетмайстра ў працэсе стварэння харэаграфічнай кампазіцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Самастойнасць, узаемасувязь і ўзаемазалежнасць музычнага і харэаграфічнага відаў мастацтва.

Асноўныя прынцыпы ўзаемадзеяння музыкі і харэаграфіі.

Параметры ўзаемасувязі музыкі і харэаграфіі: метр, рытм, тэмп, мелодыя, інтанацыя, фактура, вобраз, форма-структура, жанр, стыль.

Прынцыпы падбору музычнага матэрыялу для харэаграфічнага ўвасаблення і работы з канцэртмайстрам па праслухоўванні і аналізу музычнага твора.

Асаблівасці работы балетмайстра з музычнай фанаграмай.

Аналіз музычнага твора.

Работа балетмайстра па стварэнні харэаграфічнай кампазіцыі на завершаны музычны твор.

Кампіляцыя як метад злучэння, мантажу асобных эпізодаў і фрагментаў у адзіны мастацка-цэласны музычны твор.

**Тэма 7. Работа балетмайстра па стварэнні харэаграфічнага вобраза**

Вобраз у харэаграфічным мастацтве, яго функцыі і спецыфічныя асаблівасці.

Вобраз як форма ўвасаблення мастацкай задумы балетмайстра, ідэі і драматургіі харэаграфічнага твора.

Узаемасувязь і ўзаемазалежнасць музычнага і харэаграфічнага вобразаў у сцэнічнай кампазіцыі.

Вобразнасць танцавальнага твора, спосабы і прыёмы яе стварэння і развіцця.

Прынцыпы работы балетмайстра па стварэнні харэаграфічнага вобраза.

Асноўныя законы драматургічнага развіцця харэаграфічнага вобраза.

Сродкі пластычнай выразнасці ў характарыстыцы сцэнічнага вобраза.

Стварэнне вобразных малюнкаў і вобразнай лексікі ў працэсе рэалізацыі харэаграфічнай задумы.

Работа балетмайстра па стварэнні харэаграфічнага вобраза: перспектыва і звышзадача, тэхніка настрою, псіхалагічная паўза і інш.

Выяўленне сродкамі пластычнай выразнасці ўнутраных і знешніх рыс персанажа, іх адзінства і мастацкай цэласнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 8. Работа балетмайстра ў дзіцячым харэаграфічным калектыве**

Танцавальная творчасць як сродак эстэтычнага, духоўнага і фізічнага выхавання дзяцей дашкольнага, школьнага ўзросту і падлеткаў.

Роля харэаграфічнага мастацтва ў фарміраванні вобразнага мыслення дзяцей.

Педагагічныя патрабаванні да арганізацыі працэсу навучання харэаграфічнаму мастацтву ў дзіцячым танцавальным калектыве.

Спецыфіка работы балетмайстра ў дзіцячым харэаграфічным калектыве.

Асноўныя задачы працэсу навучання: фарміраванне творчай асобы дзіцяці, прылучэнне да каштоўнасцей харэаграфічнай культуры.

Формы і метады выхаваўчай работы балетмайстра ў дзіцячым танцавальным калектыве.

Улік узроставых і індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцей пры арганізацыі працэсу навучання харэаграфічнаму мастацтву.

Дыферэнцыраваны падыход да кожнага ўдзельніка танцавальнага ансамбля як метад навучальна-выхаваўчай работы.

Формы і віды творчай дзейнасці дзяцей у харэаграфічным калектыве.

Асноўныя педагагічныя прынцыпы работы з дзецьмі ў працэсе правядзення вучэбных заняткаў па харэаграфіі.

Арганізацыя і забеспячэнне неабходных умоў для паспяховага рашэння дзіцячым танцавальным калектывам вучэбных і творчых задач, дасягнення эфектыўных творчых вынікаў.

Музычнае выхаванне ўдзельнікаў дзіцячага харэаграфічнага ансамбля.

Прынцыпы падбору музычнага матэрыялу для правядзення вучэбных заняткаў у адпаведнасці з узроставымі асаблівасцямі ўдзельнікаў дзіцячага танцавальнага калектыву.

Фарміраванне рэпертуару дзіцячага харэаграфічнага ансамбля.

Методыка работы балетмайстра па арганізацыі і правядзенні пастановачнага і рэпетыцыйнага працэсаў у дзіцячым танцавальным калектыве.

Прынцыпы арганізацыі канцэртнай дзейнасці дзіцячага харэаграфічнага ансамбля.

Канцэрт як вышэйшая форма калектыўнай творчай дзейнасці, дэманстрацыя дасягненняў удзельнікаў дзіцячага танцавальнага калектыву.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Удзел у фэстах, конкурсах і іншых форумах як важнейшы стымул творчага развіцця ўдзельнікаў дзіцячага харэаграфічнага калектыву.

**Тэма 9. Работа балетмайстра па стварэнні харэаграфічнай кампазіцыі для дзяцей**

Стварэнне харэаграфічнай кампазіцыі для дзяцей на аснове мастацкіх узораў народнай творчасці (казак, песень, гульняў, вусна-паэтычнага, дэкаратыўна-прыкладнога і іншых відаў мастацтваў).

Прынцыпы падбору музычнага матэрыялу, даступнага для ўспрымання дзіцяці, яго светаадчування і разумення.

Сюжэтна-гульнявая форма як спосаб рэалізацыі харэаграфічнай задумы.

Танцавальная вобразнасць і сродкі яе ўвасаблення ў дзіцячай харэаграфічнай кампазіцыі.

Методыка работы балетмайстра па стварэнні танцавальнага твора для дзяцей.

Асаблівасці работы харэографа-пастаноўшчыка па мастацкім афармленні танцавальнай кампазіцыі для дзяцей.

Спецыфіка падбору касцюма, аксесуараў, макіяжа для выканаўцаў-дзяцей.

**Тэма 10. Стварэнне сцэнічнай кампазіцыі на аснове беларускага харэаграфічнага фальклору**

Азначэнне паняцця "харэаграфічны фальклор", яго сацыяльная прырода, значэнне і функцыі ў традыцыйнай беларускай культуры.

Багацце і разнастайнасць фальклорнай харэаграфічнай спадчыны беларускага народа.

Адметныя рысы беларускага харэаграфічнага фальклору.

Рэгіянальныя і лакальныя асаблівасці беларускай народнай харэаграфіі, іх агульная характарыстыка.

Узаемадзеянне беларускай танцавальнай культуры і танцавальнай культуры іншых народаў.

Прынцыпы класіфікацыі народнай харэаграфіі, характарыстыка яе асноўных жанраў.

Асноўныя этапы стварэння сцэнічнай кампазіцыі на аснове беларускага харэаграфічнага фальклору.

Прынцыпы работы харэографа-пастаноўшчыка з фальклорнай першакрыніцай.

Работа балетмайстра з канцэртмайстрам па сцэнічнай апрацоўцы музычнага матэрыялу да фальклорнага танцавальнага ўзору.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівасці работы балетмайстра з музычным матэрыялам у працэсе сцэнічнай інтэрпрэтацыі харэаграфічнага фальклору.

Узаемадзеянне музычнага і танцавальнага матэрыялу ў плане формы, стылю, жанру.

Методыка работы балетмайстра пры стварэнні сцэнічнай кампазіцыі на аснове беларускай народнай танцавальнай творчасці.

Прынцыпы работы харэографа-пастаноўшчыка па сцэнічнай інтэрпрэтацыі ўзораў беларускага харэаграфічнага фальклору.

**Тэма 11. Стварэнне тэатралізаванага прадстаўлення (тэматычнага паказу, харэаграфічнага спектакля, фальклорнай вечарыны) на аснове беларускай народнай танцавальнай творчасці**

Работа балетмайстра з матэрыяламі галіновай навукова-даследчай лабараторыі беларускай танцавальнай творчасці Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў з мэтай падбору харэаграфічнага ўзору да фальклорнага спектакля.

Спецыфіка работы харэографа-пастаноўшчыка з архівам па падборы фальклорнага ўзору для сцэнічнага ўвасаблення.

Даследчая работа балетмайстра па вывучэнні рэгіянальных і лакальных асаблівасцей беларускага харэаграфічнага фальклору.

Спецыфіка работы харэографа-пастаноўшчыка з канцэртмайстрам па апрацоўцы музычных узораў да фальклорных танцавальных першакрыніц.

Асноўныя прынцыпы работы харэографа-пастаноўшчыка з харэаграфічным фальклорам.

Методыка работы балетмайстра па ўзнаўленні харэаграфічнай першакрыніцы.

Вывучэнне ўскосных крыніц пры стварэнні ўзораў беларускага харэаграфічнага фальклору.

Распрацоўка скразной драматургіі тэатралізаванага прадстаўлення на матэрыяле беларускай танцавальнай творчасці.

Стварэнне тэатралізаванага прадстаўлення на аснове беларускіх абрадаў і свят.

Стварэнне тэатралізаванага прадстаўлення на аснове кадрыляў і гарадскіх бытавых танцаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 12. Стварэнне харэаграфічнай кампазіцыі ў форме сольнага, дуэтнага, камернага танцаў**

Паняцце "сола" ў харэаграфічным мастацтве, азначэнне і сціслая характарыстыка.

*Сольны танец* – форма харэаграфічнага твора; выкананне адным танцоўшчыкам фрагмента танцавальнага твора або самастойнага канцэртнага нумара.

Сольны танец у класічнай, сучаснай і народна-сцэнічнай харэаграфіі, параўнальная характарыстыка.

Выразныя сродкі пры стварэнні танцавальнай партыі для аднаго саліста.

Прынцыпы складання харэаграфічнай кампазіцыі для аднаго саліста.

Асноўныя этапы пастановачнай работы пры стварэнні сольнай кампазіцыі.

Прынцыпы падбору музычнага матэрыялу для жаночых і мужчынскіх сольных партый.

Узаемасувязь сольнага танца і формы, жанру, структуры музычнага матэрыялу.

Стварэнне харэаграфічнага вобраза з выкарыстаннем выразных сродкаў сольнага танца.

Прынцыпы падбору выканаўцаў для пэўнага сольнага нумара ў залежнасці ад амплуа танцоўшчыка, яго тэхнічнай падрыхтоўкі і фізічных даных.

Методыка работы балетмайстра пры стварэнні харэаграфічнай кампазіцыі на аднаго саліста.

Паняцце "дуэт" у харэаграфічным мастацтве, азначэнне і сціслая характарыстыка.

*Дуэтны танец* – форма харэаграфічнага твора; выкананне двума танцоўшчыкамі (аднаго полу або процілеглых полаў) самастойнага сцэнічнага нумара.

Дуэтны танец у класічнай, сучаснай і народна-сцэнічнай харэаграфіі, параўнальная характарыстыка.

Разнавіднасці дуэтнага танца ў сцэнічнай харэаграфіі.

Майстэрства падтрымкі ў дуэтным танцы. Работа харэографа-пастаноўшчыка з выканаўцамі па авалоданні тэхнікай выканання падтрымкі ў дуэтным танцы.

Методыка работы балетмайстра пры стварэнні харэаграфічнай кампазіцыі на двух салістаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Азначэнне паняцця "камерны танец", яго характарыстыка і структура.

*Камерны танец* – форма харэаграфічнага ансамбля; выкананне групай танцоўшчыкаў самастойнага сцэнічнага нумара.

Дывертысментны і дзейсны характар камернага танца.

Разнавіднасці камернага танца ў сцэнічнай харэаграфіі, іх склад і агульная характарыстыка.

*Трыо* – форма камернага танца; выкананне трыма танцоўшчыкамі (аднаго полу або процілеглых полаў) самастойнага харэаграфічнага нумара.

Трыо ў класічнай, сучаснай і народна-сцэнічнай харэаграфіі, параўнальная характарыстыка.

*Квартэт* – форма камернага танца; выкананне чатырма танцоўшчыкамі (аднаго полу або процілеглых полаў) самастойнага харэаграфічнага нумара.

Квартэт у класічнай, сучаснай і народна-сцэнічнай харэаграфіі, параўнальная характарыстыка.

Методыка работы балетмайстра пры стварэнні камернага танца.

**Тэма 13. Прыёмы поліфанічнай перадачы харэаграфічнай фактуры**

Азначэнне паняцця "поліфанія", агульная характарыстыка.

Шматгалоссе ў музычным мастацтве, спецыфіка і агульная характарыстыка.

Прыёмы поліфанічнай перадачы музычнага твора, агульныя паняцці.

Паняцце "поліфанічны прыём" у адносінах да харэаграфіі.

Поліфанічны прыём – сродак стварэння мастацкай выразнасці ў харэаграфічным творы.

Прынцыпы выкарыстання поліфанічных прыёмаў пры стварэнні танцавальнай кампазіцыі.

Простыя прыёмы поліфанічнай перадачы харэаграфічнай фактуры.

Методыка выкарыстання поліфанічных прыёмаў у арганізацыі танцавальнага матэрыялу.

Узаемасувязь малюнка танца і поліфанічнай арганізацыі пластычных матываў.

Найбольш складаныя прыёмы поліфанічнай перадачы харэаграфічнай фактуры.

Выкарыстанне поліфанічных прыёмаў у харэаграфічных творах айчынных і замежных балетмайстраў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 14. Стварэнне харэаграфічнай кампазіцыі на матэрыяле беларускай народнай творчасці ў сучаснай апрацоўцы**

Сучасная тэма і яе сцэнічнае ўвасабленне ў харэаграфіі.

Засваенне балетмайстрам сучаснай тэмы – адна з галоўных задач у навучанні прафесійнаму майстэрству.

Прынцыпы стварэння харэаграфічнай кампазіцыі на матэрыяле беларускай народнай творчасці ў сучаснай апрацоўцы.

Фарміраванне мастацкай задумы танцавальнай кампазіцыі.

Вызначэнне тэмы і ідэі сучаснай мастацкай кампазіцыі.

Вырашэнне сучаснай тэмы сродкамі розных жанраў сцэнічнай харэаграфіі: класічнага, народна-сцэнічнага беларускага, эстраднага танцаў.

Асаблівасці падбору і аналізу музычнага твора для ўвасаблення харэаграфічнай кампазіцыі на сучасную тэму.

Распрацоўка драматургіі сучаснага танцавальнага твора.

Асаблівасці работы балетмайстра пры складанні праграмы і кампазіцыйнага плана сучаснай пастаноўкі.

Фарміраванне вобраза ў танцавальным творы на сучасную тэму.

Раскрыццё харэаграфічнага вобраза з дапамогай розных сродкаў пластычнай выразнасці.

**Тэма 15. Работа балетмайстра з мастаком па сцэнічным афармленні харэаграфічнай кампазіцыі**

Творчае супрацоўніцтва балетмайстра і мастака, іх задачы і сумесныя рашэнні па сцэнічным афармленні танцавальнага твора.

Адзінства ідэйна-творчых пазіцый балетмайстра і мастака пры стварэнні харэаграфічнай кампазіцыі.

Методыка работы мастака над сцэнічным афармленнем танцавальнага твора.

Мастацкая задума балетмайстра – аснова работы мастака па сцэнічным афармленні харэаграфічнай кампазіцыі.

Узаемасувязь музычнага матэрыялу і мастацкага афармлення танцавальнага твора.

Залежнасць мастацкага рашэння ад драматургіі і сцэнічных вобразаў харэаграфічнай кампазіцыі.

Выразныя сродкі сцэнічнага афармлення танцавальнага твора.

Святло, дэкарацыі, рэквізіт як састаўныя часткі і выразныя сродкі мастацкага рашэння харэаграфічнага нумара.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівасці работы мастака пры стварэнні светлавой партытуры да танцавальнага твора.

Спецыфічныя патрабаванні да канцэртнага касцюма пры мастацкім афармленні танцавальнага твора.

Касцюм як выразны сродак харэаграфічнага вобраза.

Аксесуары як дадатковыя элементы і выразныя сродкі канцэртнага касцюма.

**Тэма 16. Стварэнне арыгінальнай харэаграфічнай кампазіцыі на матэрыяле беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі да экзамену**

Фарміраванне мастацкай задумы арыгінальнай кампазіцыі на матэрыяле беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі.

Вызначэнне тэмы і ідэі танцавальнай кампазіцыі.

Прынцыпы стварэння арыгінальнай кампазіцыі на матэрыяле беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі.

Падбор музычнага матэрыялу для харэаграфічнай кампазіцыі.

Выбар стылю, жанру, характару харэаграфічнай кампазіцыі.

Распрацоўка драматургіі арыгінальнай харэаграфічнай кампазіцыі.

Складанне праграмы і кампазіцыйнага плана арыгінальнай харэаграфічнай кампазіцыі.

Увасабленне задумы балетмайстра ў харэаграфічнай пастаноўцы.

Выразныя сродкі арыгінальнай сцэнічнай кампазіцыі.

Работа над канцэпцыяй сцэнічнага афармлення, светлавога рашэння і сцэнічнага касцюма харэаграфічнай пастаноўкі.

Распрацоўка сцэнарыя харэаграфічнай кампазіцыі да экзамену-канцэрта.

Планаванне і арганізацыя пастановачнага і рэпетыцыйнага працэсаў.

Арганізацыя і правядзенне рэпетыцый і генеральнага прагону ў працэсе падрыхтоўкі да экзамену-канцэрта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ
## 40 гадзін

**Тэма: Работа балетмайстра па стварэнні харэаграфічнага вобраза**

1. Стварэнне вобразных малюнкаў і вобразнай лексікі ў працэсе рэалізацыі харэаграфічнай задумы.
2. Работа балетмайстра па стварэнні харэаграфічнага вобраза:
- перспектыва і звышзадача,
- тэхніка настрою,
- псіхалагічная паўза і інш.

3. Выяўленне сродкамі пластычнай выразнасці ўнутраных і знешніх рыс персанажа, іх адзінства і мастацкай цэласнасці.

**Тэма: Работа балетмайстра ў дзіцячым харэаграфічным калектыве**

1. Музычнае выхаванне ўдзельнікаў дзіцячага харэаграфічнага ансамбля.
2. Прынцыпы падбору музычнага матэрыялу для правядзення вучэбных заняткаў у адпаведнасці з узроставымі асаблівасцямі ўдзельнікаў дзіцячага танцавальнага калектыву.
3. Фарміраванне рэпертуару дзіцячага харэаграфічнага ансамбля.
4. Методыка работы балетмайстра па арганізацыі і правядзенні пастановачнага і рэпетыцыйнага працэсаў у дзіцячым танцавальным калектыве.
5. Прынцыпы арганізацыі канцэртнай дзейнасці дзіцячага харэаграфічнага ансамбля.
6. Канцэрт як вышэйшая форма калектыўнай творчай дзейнасці, дэманстрацыя дасягненняў удзельнікаў дзіцячага танцавальнага калектыву.
7. Удзел у фэстах, конкурсах і іншых форумах як важнейшы стымул творчага развіцця ўдзельнікаў дзіцячага харэаграфічнага калектыву.

**Тэма: Работа балетмайстра па стварэнні харэаграфічнай кампазіцыі для дзяцей**

1. Стварэнне харэаграфічнай кампазіцыі для дзяцей на аснове мастацкіх узораў народнай творчасці:
- казак
- песень
- гульняў
- вусна-паэтычнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- дэкаратыўна-прыкладнога
- іншых відаў мастацтваў.

2. Прынцыпы падбору музычнага матэрыялу, даступнага для ўспрымання дзіцяці, яго светаадчування і разумення.
3. Сюжэтна-гульнявая форма як спосаб рэалізацыі харэаграфічнай задумы.
4. Танцавальная вобразнасць і сродкі яе ўвасаблення ў дзіцячай харэаграфічнай кампазіцыі.
5. Методыка работы балетмайстра па стварэнні танцавальнага твора для дзяцей.
6. Асаблівасці работы харэографа-пастаноўшчыка па мастацкім афармленні танцавальнай кампазіцыі для дзяцей.
7. Спецыфіка падбору касцюма, аксесуараў, макіяжа для выканаўцаў-дзяцей.

**Тэма: Стварэнне сцэнічнай кампазіцыі на аснове беларускага харэаграфічнага фальклору**

1. Работа харэографа-пастаноўшчыка з фальклорнай першакрыніцай.
2. Работа балетмайстра з канцэртмайстрам па сцэнічнай апрацоўцы музычнага матэрыялу да фальклорнага танцавальнага ўзору.
3. Работа балетмайстра з музычным матэрыялам у працэсе сцэнічнай інтэрпрэтацыі харэаграфічнага фальклору.
4. Методыка работы балетмайстра пры стварэнні сцэнічнай кампазіцыі на аснове беларускай народнай танцавальнай творчасці.

